# СТРУКТУРА І АСАБЛІВАСЦІ КАНТЭНТУ ІНФАРМАЦЫЙНАГА ПАРТАЛА «ПРАВДА ГОМЕЛЬ»

***В. А. Зразікава***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*вул. Кальварыйская 9, 220004, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,*
*zrazikova@tut.by*

Даследуюцца структурныя і зместавыя асаблівасці інфармацыйнага партала «Правда Гомель». Улічваючы асноўныя патрабаванні да інтэрнэт-камунікацыі (мультымедыйнасць, канвергентнасць, інтэрактыўнасць), аналізуецца работа рэгіянальнай рэдакцыі па стварэнні і дыстрыбуцыі медыякантэнту новай генерацыі, а таксама праблемы і складанасці на гэтым шляху.

***Ключавыя словы***: анлайн-СМІ; аўдыторыя СМІ; інфармацыйны партал; кантэнт; канцэпцыя; сацыяльныя медыя.

# CONTENT STRUCTURE AND FEATURES OF THE INFORMATION PORTAL «TRUTH GOMEL»

***V. A. Zrazikova***

*Belarusian State University,*
*9, Kalvariyskaya Str., 220004, Minsk, Republic of Belarus*
*Corresponding author: V. A. Zrazikova (zrazikova@tut.by)*

The structural and content features of the information portal «True Gomel» are examined. The work of the regional editorial office on the creation and distribution of new generation media content, as well as related problems and difficulties is analyzed, taking into account the main requirements for Internet communication (multimedia, convergence, interactivity).

***Key words:*** online media; media audience; informational portal; content; concept; social media.

Беларускія рэгіянальныя СМІ адлюстроўваюць розныя ступені і магчымасці развіцця ў лічбавай прасторы. Найбольш прыярытэтным і перспектыўным напрамкам бачыцца пераход ад фармату газетнага сайта да мадэлі паўнавартаснага інфармацыйнага партала з разгалінаванай сістэмай генерацыі кантэнту, укараненнем мультымедыйных тэхналогій, пашырэннем зместавага дыяпазону, высокім узроўнем інтэрактыўнасці. Гэта дазваляе максімальна сегментаваць аўдыторыю і задаволіць інфармацыйныя запыты лакальнага характару.

Інфармацыйныя парталы займаюць адметнае месца ў сістэме рэгіянальных інтэрнэт-СМІ і патрабуюць асобнага вывучэння. Партал як маштабны вэб-рэсурс можа служыць пляцоўкай для размяшчэння інфармацыйных і камунікатыўных сэрвісаў, відэаматэрыялаў, рэкламных медыятэкстаў, версій для мабільных медыя, політэматычнай інфармацыі з магчымасцямі яе далейшага імпартавання ў сацыяльныя сеткі.

Да станоўчых прыкладаў фарміравання медыякантэнту падобнага тыпу належыць інфармацыйны партал газеты «Гомельская праўда» – «Правда Гомель». Яго можна аднесці да кросплатформавых медыя, паколькі для дыстрыбуцыі кантэнту журналісты выкарыстоўваюць не толькі магчымасці сайта, але і сацыяльныя сеткі («ВКонтакте – 30 080 падпісчыкаў, «Одноклассники» – 19 441, «Instagram» – 8 471, «Facebook» – 3 169, «YouTube» – 2 000, «Twitter» – 1 414, «Telegram» – 180), месенджараў («Viber» – 103) і RSS-каналаў (статыстычныя звесткі адносна колькасці падпісчыкаў у сацыяльных медыя прыведзены на момант даследавання).

Праблемы, звязаныя з функцыянаваннем партала ў сацыяльных медыя, структурнай арганізацыяй яго публічнай старонкі, асаблівасцямі падачы кантэнту, заслугоўваюць спецыяльнага разгляду [1]. Задача сеткавых СМІ – прапанаваць канвергаваны інфармацыйны прадукт, складнікі якога будуць функцыянаваць самастойна, узаемадзейнічаць і дапаўняць адзін аднаго: напрыклад, апублікаваць матэрыял на сайце, а ў сацыяльных медыя даць спасылку на публікацыю, правесці апытанне сярод карыстальнікаў па закранутай праблеме, заклікаць да выказвання асабістага меркавання, каментавання.

Адпаведнасць сеткавага кантэнту партала сучасным патрабаванням інтэрнэт-СМІ разглядалася намі ў папярэдніх публікацыях [2], таму асноўную ўвагу звернем на структурна-зместавы кампанент мультымедыйнай платформы як эфектыўнага механізму фарміравання канцэпцыі рэгіянальных інтэрнэт-СМІ.

Партал «Правда Гомель» мае шматузроўневую сістэму рубрыкацыі, якая дазваляе задаволіць разнастайныя інфармацыйна-камунікатыўныя запатрабаванні карыстальнікаў: «Аб’явы» («Праца», «Арганізацыі», «Карты», «Карта Wi-Fi»), «Рэклама», «Выдавецтва», «Падпіска», «Правда Радио».

Для тых, хто аддае перавагу традыцыйным формам інфармавання, на партале размешчаны pdf-версіі нумароў газет, набыць поўныя электронныя варыянты якіх можна анлайн, праз сістэму аплаты сэрвіса «Белкіёск». Атрымаць выданні магчыма ці праз куплю асобнага нумара, ці праз падпіску.

Галоўны інфармацыйны парадак партала як грамадска-палітычнага выдання вызначаюць пастаянныя рубрыкі: «Грамадства», «Эканоміка», «Адукацыя», «Культура», «НЗ і крымінал», «Спорт», «Здароўе», «IT», «Аўтанавіны», «Рэгіёны», «Афіша». Большасць з іх мае свае падрубрыкі (ад трох да дзевяці). Пры такой колькасці падрубрык выяўляецца праблема нерэгулярнага абнаўлення асобных з іх. Напрыклад, апошнія матэрыялы падрубрык «Прыгажосць», «Медыцына і здароўе» (рубрыка «Здароўе»), «Бізнес і фінансы» («Эканоміка»), «Дзіцячы сад», «Універсітэты» («Адукацыя») датуюцца 2019 годам. За 2020 год у іх няма ніводнай публікацыі. Падрубыка «Аналітыка» («Эканоміка») увогуле інфармуе аб тым, што ў гэтай катэгорыі няма матэрыялаў. Верагодна, як кампенсацыя за адсутнасць аналітычных матэрыялаў з эканамічнай сферы на галоўнай старонцы партала размешчаны раздзел «Меркаванні» з публікацыямі калумністаў выдання.

Рэспубліканскія і сусветныя падзеі асвятляюцца ў раздзелах партала «Навіны Беларусі» і «Навіны свету» (стужка навін). Прадугледжаны спецыяльныя рубрыкі-банеры па актуальных і важных мерапрыемствах рэгіёна («Вандруй разам з намі», «Год малой радзімы», «Наша Гомельшчына, наша краіна», «75 гадоў са дня вызвалення Беларусі», «Прэс-цэнтр», «Прамая размова»). Банерная рубрыкацыя выкарыстана ў рэпрэзентацыі забаўляльна-пазнавальнага кантэнту: «Фотазахапленне», «Ода агароду», «Гараскоп». На жаль, і тут назіраецца адсутнасць «свежых» публікацый («Пальчыкі абліжаш» – 2018, «Адчайныя гаспадыні» – 2019). З 2019 года на партале не абнаўляліся рубрыкі, створаныя з рэкрэацыйнымі мэтамі: «Мудра сказана», «Кніга Гінеса». Тры з пяці рубрык гэтай групы «Анекдот» (ілюстрацыі да анекдотаў – карыкатуры з інтэрнэту), «Калейдаскоп» (самыя нізкія паказчыкі прагляду матэрыялаў – да 700), «Тэсты» абнаўляюцца сістэматычна.

У асобны банерны рад вылучаны рубрыкі «Фотанавіны», «Галоўныя навіны дня», «Конкурсы». У іх шэрагу да інавацыі можна аднесці рэгулярную вытворчасць відэаматэрыялаў для рубрыкі «Галоўныя навіны дня». Працягласць відэанавіны складае каля хвіліны і прагледзець яе можна праз платформу «YouTube». Партал таксама мае свой канал на гэтым відэахостынгу, аднак прагляды на ім значна саступаюць праглядам на самім партале. Калі ў лютым за дзень на «YouTube» было ў сярэднім 26 праглядаў навін, то на партале – больш за 600. Неабходна і далей развіваць відэафармат, пашыраючы яго не толькі навінамі, але і рэпартажамі, інтэрв’ю, аналітыкай, спецпраектамі. Для гэтага трэба прыцягваць адпаведных спецыялістаў: не кожны журналіст можа самастойна зрабіць якасны відэапрадукт.

Да размяшчэння асобных банераў партала ўзнікаюць пытанні: напрыклад, рэклама помнікаў у стужцы навін пад рубрыкай «Надзвычайныя здарэнні і крымінал». Супадзенне гэта ці не? І наколькі этычна і эстэтычна такое «ўкрапленне»? Безумоўна, рэклама павінна манетызаваць кантэнт, аднак не за кошт страты відавочных прыярытэтаў.




*Мал. 1. Скрыншот з галоўнай старонкі партала*

На рэдакцыйную палітыку сеткавых СМІ ўплывае аматарскі (спажывецкі) кантэнт, у выніку чаго ўзнікаюць папулярныя агляды, рэйтынгі («Топ-10 снимков из Instagram» (tut.by), «Топ-7 фото Беларуси из Instagram» (Белновости)); travel-гісторыі з элементамі нарыса, рэпартажу ці інтэрв’ю (tut.by); чытацкія лісты як асобныя публікацыі з далучанымі да іх каментарыямі ці кансультацыямі адпаведных спецыялістаў (юрыстаў, псіхолагаў) (tut.by), каментарыі, форумы, апытанні. Перспектыўнымі будуць якраз тыя фарматы, што дазволяць аўдыторыі карыстацца творчымі інструментамі для стварэння прасьюмерскага кантэнту.

У рабоце партала адсутнічаюць згаданыя і апрабаваныя на практыцы іншымі СМІ інтэрактыўныя формы камунікацыі, ёсць фрагментарныя спробы наладзіць інтэрактыў: рубрыка «Конкурс»; рубрыка «Пытанне-адказ»; заклік аўтара напрыканцы публікацыі паспрачацца з ім у групах сацыяльных медыя (адзінкавыя выпадкі); тэсты. Найбольш эфектыўны сродак сярод іх – гэта тэсты, якія ствараюцца штомесяц і вызначаюцца шырокім тэматычных ахопам. У адрозненне ад іншых сеткавых СМІ тэсты партала вызначаюцца грунтоўным аналізам вынікаў: правільныя і няправільныя адказы падаюцца ў выглядзе дыяграмы. Нягледзячы на тое, што тэсты адрозніваюцца высокай статыстыкай праглядаў (за 2-3 тыс.), узровень актыўнасці каментарыяў у іх нулявы.

Арыгінальны мультымедыйны кантэнт партала фарміруецца і за кошт радыёстанцыі «Правда Гомель». Яна вяшчае кожныя суткі на частаце 99,0 МГц у Гомелі, на частаце 99,3 МГц у Жлобіне, Светлагорску, Рагачове і Буда-Кошалёве, на частаце 88,1 МГц у Мазыры, Жыткавічах, Калінкавічах, Петрыкаве, Ельску, Лельчыцах і Акцябрскім. Радыйны кантэнт складаюць securityнафарматныя падкасты праграм «Шарлотка-драйв» (кулінарная тэматыка), «Правда Рок», «Сделано в СССР», «Бонус-трек» (музычна-забаўляльныя фарматы), «Наши в городе» (ранішняе шоу), «Правда гость» (інтэрв'ю), «Подружка безопасности» (здарэнні на дарогах, адказы супрацоўнікаў ДАІ на пытанні слухачоў). Радыё мае акаўнты ў сацыяльных медыя «ВКонтакте» (1 377) і «Instagram» (1 523).

Аднак інтэграванне падкастынгу як папулярнага сярод сеткавых СМІ (tut.by, onliner.by, Meduza, РИА Новости) фармату камунікавання з аўдыторыяй на самім партале (аўтаномна ад радыёвяшчання) не назіраецца. Новая генерацыя медыякантэнту (аўдыяпадкасты, мульты-скрыпты, вэб-рэпартажы, лангрыды, відэаматэрыялы, інтэрактыўныя інфаграфіка і таймлайны) вызначае аблічча вэб-журналістыкі. Падобныя фарматы ствараюцца і «жывуць» выключна анлайн [3]. Рэгіянальныя СМІ толькі робяць першыя крокі да іх асваення.

У сеткавых выданнях узнікаюць своеасаблівыя жанры, якія набываюць новыя формы і функцыі дзякуючы сваёй гібрыдызацыі, канатацыі і сінтэзацыі. Гэты працэс залежыць ад тэхнічных магчымасцяў і рэдакцыі, і вэб-асяродку, і ад творчых фактараў, і ад выбару камунікатыўных стратэгій.

Партал «Правда Гомель» стварае ўласны медыякантэнт з перавагай рэгіянальнай інфармацыі, аднак задзейнічае не ўсе мультымедыйныя магчымасці платформы і не выкарыстоўвае ўвесь спектр сродкаў прыцягнення ўвагі карыстальнікаў.

У адпаведнасці з разгледжанымі асаблівасцямі можна канстатаваць, што ў інфармацыйна-камунікатыўнай прасторы фарміруецца новая канцэпцыя рэгіянальных інтэрнэт-СМІ, якая ўключае трансфармацыю на ўзроўні медыякантэнту, структуры, арганізацыі і кіравання, сістэмы камунікацыі і сэрвісу. Гэта фарміруе, па-першае, якасна новы ўзровень працэсаў падрыхтоўкі, апрацоўкі, дастаўкі медыякантэнту аўдыторыі, а па-другое, новыя формы і інструменты дзейнасці СМІ як політэматычных і поліфункцыянальных інтэрнэт-парталаў.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Лебедева М. Л. Репрезентация художественного текста в социальных сетях // Журналістыка-2019: стан, праблемы і перспектывы : матэрыя-

лы 21-й Міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 14–15 ліст. 2019 г. / рэдкал. : В. М. Самусевіч (адк. рэд.) [і інш.]. Мінск : БДУ, 2019. С. 57–60.
2. Зразикова В. А. Соответствие сетевого контента современным требованиям интернет-СМИ (на примере belnovosti.by, director.by и gp.by) // Мультимедийная журналистика: медиакоммуникации и медиаиндустрия : материалы II Междунар. науч.-практ. конф., Минск, 1 марта 2019 г. Минск: БГУ, 2019. С. 66–70.
3. Зразікава В. А. Мультымедыйны кантэнт беларускіх анлайн-СМІ (на прыкладзе аўдыяпадкастаў) // Журналістыка-2018: стан, праблемы і перспектывы : матэрыялы 20-й Міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 15–16 ліст. 2018 г. / рэдкал.: В. М. Самусевіч (адк. рэд.) [і інш.]. Мінск : БДУ, 2018. С. 453–456.

## ІНТЭГРАЦЫЙНЫ ПАТЭНЦЫЯЛ МЕДЫЯ

***Н. А. Зубчонак***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*вул. Кальварыйская, 9, 220004, г. Мінск, Республика Беларусь,*
*Zubchon@bsu.by*

У артыкуле інтэграцыйны патэнцыял медыя разглядаецца ў кантэксце перпектыў рэгіянальнага развіцця, сацыяльна-эканамічнай, культурнай і інавацыйнай стратэгіі краіны; абгрунтавана неабходнасць медыйнага суправаджэння працэсу рэгіянальнай інтэграцыі ў Рэспубліцы Беларусь.

***Ключавыя словы:*** медыя; рэгіён; інтэграцыя; стратэгія; сацыяльна-эканамічнае развіццё.

## INTEGRATION POTENTIAL OF MEDIA

***N. A. Zubchonak***

*Belarusian State University,*
*9, Kalvariyskaya Str., 220004, Minsk, Republic of Belarus*
*Corresponding author: N. A. Zubchonak (Zubchon@bsu.by)*

The article considers the integration potential of the media in the context of the prospects for regional development, socio-economic, cultural and innovative strategy of the country the necessity of media support for the process of regional integration in the Republic of Belarus is justified.

***Key words:*** media; region; integration; strategy; socio-economic development.

Пытанням развіцця рэгіянальнай інфармацыйнай прасторы ў апошні час надаецца значная ўвага па многіх прычынах. Па-першае, дадзены сегмент медыясферы з’яўляецца носьбітам унікальнага лакальнага